# МЯЖА ПАД НАДЗЕЙНАЙ АХОВАЙ

**Пытанні пагранічнай бяспекі абмеркаваны ў час даклада Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Леаніда Мальцава, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ведае праблемы пагранічнай службы знутры, і нагадаў, што ў свой час быў прааналізаваны шэраг актуальных пытанняў, якія стаяць перад ведамствам. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся таксама перспектыўнымі напрамкамі ўладкавання інфраструктуры мяжы. Пры гэтым ён перасцярог ад увязвання ў сумніўныя праекты. «Вось я ніяк не магу прывыкнуць да гэтых вашых беспілотнікаў. Калі яны даюць эфект і вы за кошт гэтага менш сродкаў расходуеце на ахову мяжы, больш выяўляеце парушальнікаў — калі ласка, няхай гэта сучаснае будзе, але не дай Бог мы няправільным шляхам пойдзем — вось гэтага дапусціць нельга», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«І вельмі важнае пытанне — украінская мяжа. Мы дамаўляліся, што нам трэба сур'ёзна весці работы на ёй у плане дэмаркацыі. Украінскія сябры не могуць на нас пакрыўдзіцца, таму што не мы былі ініцыятарамі, яны гэтага захацелі, яны гэтую работу пачалі, мы вымушаны былі таксама пачаць. Як яны працуюць, як мы працуем і што наогул адбываецца на ўкраінскай мяжы, наколькі яна можа нас сёння насцярожваць, хваляваць?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня Дзяржпагранкамітэта далажыў, што стан пагранічнай бяспекі краіны ацэньваецца як стабільны. Органы пагранічнай службы выконваюць свае задачы ў штатным рэжыме. У напружаным і дынамічным стане знаходзяцца пункты пропуску напярэдадні калядных і навагодніх свят. Аднак Леанід Мальцаў запэўніў, што Дзяржпагранкамітэт гатовы да любых змен сітуацыі.

Што датычыцца даручэнняў Прэзідэнта па забеспячэнні надзейнай пагранічнай бяспекі краіны, то яны выконваюцца ў поўным аб'ёме ў вызначаныя тэрміны і якасна. У прыватнасці, аптымізавана арганізацыйна-штатная структура, што дало магчымасць узмацніць ахову дзяржаўнай мяжы, у тым ліку на паўднёвым напрамку, разгарнуць дадатковыя заставы, пагранічныя пасты. Разгорнуты дзве заставы для ўзмацнення аховы ў напрамку атамнай электрастанцыі, завяршаецца разгортванне новага пагранічнага атрада ў Мазыры.

Акрамя таго, сур'ёзна павышаны ўзровень інжынернага абсталявання дзяржаўнай мяжы, у першую чаргу на паўднёвым напрамку, а таксама на літоўскім і латышскім участках. Леанід Мальцаў далажыў, што працягваюцца работы па ўкараненні электроннай чаргі ў пунктах пропуску. Адначасова завяршаецца распрацоўка праекта ўказа, які дасць магчымасць стварыць прававое поле для ўкаранення электроннай чаргі.

# ПРЫНЯТЫ БЮДЖЭТ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ НА БУДУЧЫ ГОД

## УЧОРА АДБЫЛАСЯ 47-Я СЕСІЯ ПАРЛАМЕНЦКАГА СХОДУ САЮЗА БЕЛАРУСІ І РАСІІ

**Дэпутаты ў другім чытанні прынялі саюзны бюджэт на 2015 год у памеры амаль 4,9 млрд расійскіх рублёў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Праект дэкрэта Вышэйшага дзяржаўнага савета «Аб бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2015 год» паступіў у Парламенцкі сход 10 лістапада 2014 года. У адпаведнасці з ім аб'ёмы адлічэнняў дзяржаў-удзельніц складаюць 4,872 млрд расійскіх рублёў, з якіх 3,167 млрд прыпадае на адлічэнні Расіяй і 1,705 млрд — на адлічэнні Беларуссю.

«У 2015 годзе каля 85% агульных выдаткаў бюджэту прапануецца накіраваць на выкананне 9 саюзных праграм і 28 мерапрыемстваў, у тым ліку ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, энергетыкі, транспарту, сувязі і інфарматыкі — будзе выкарыстана 42% бюджэту; на сацыяльную палітыку, ахову здароўя, адукацыю, экалогію, культуру і СМІ — 26%; ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва, праваахоўную дзейнасць, забеспячэнне бяспекі — 17%. Расходы на ўтрыманне органаў Саюзнай дзяржавы складуць менш за 10% ад агульнага аб'ёму расходнай часткі бюджэту», — сказаў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота.

Сярод 9 саюзных праграм — «Распрацоўка касмічных і наземных сродкаў забеспячэння спажыўцоў Расіі і Беларусі інфармацыяй дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі на аснове высокіх тэхналогій», «Інавацыйнае развіццё вытворчасці бульбы і тапінамбура на 2013–2016 гады», «Умацаванне памежнай бяспекі Саюзнай дзяржавы на перыяд 2012–2016 гадоў», «Удасканаленне сістэмы абароны агульных інфармацыйных рэсурсаў Беларусі і Расіі на аснове высокіх тэхналогій», «Сумесная дзейнасць па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў рамках Саюзнай дзяржавы да 2016 года».

Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі ў 2015 годзе зробіць стаўку на пашырэнне рэгіянальнага супрацоўніцтва паміж краінамі для вырашэння эканамічных праблем, заявіў падчас работы сесіі намеснік старшыні Парламенцкага сходу Іван Мельнікаў, прадстаўляючы план-графік работы сходу на 2015 год.

«Па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах эканоміка краін знаходзіцца перад новымі выклікамі, і будучы год будзе нялёгкім. Адно з рашэнняў праблемы — пашырэнне сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі. Пытанні рэгіянальнага супрацоўніцтва будуць прыярытэтнымі ў парадку дня нашых мерапрыемстваў, дзе б яны ні праходзілі», — сказаў Іван Мельнікаў.

У 2015 годзе будзе адзначацца 70-годдзе Вялікай Перамогі. «У нас адзінае разуменне цаны гэтай Перамогі. Відавочна, што пры правядзенні мерапрыемстваў Парламенцкага сходу будзе правільным наведваць воінскія мемарыялы, арганізоўваць ускладанне кветак, аддаваць наш доўг памяці загінулым воінам», — дадаў намеснік старшыні.

Паводле слоў Івана Мельнікава, у надыходзячым годзе спатрэбіцца цесная каардынацыя сумеснай работы парламентаў Беларусі і Расіі. Актыўны ўдзел саюзных дэпутатаў у мерапрыемствах нацыянальных парламентаў павінен стаць правілам.

Акрамя таго, парламентарыі Саюзнай дзяржавы ў 2015 годзе плануюць устанавіць адносіны з Міжпарламенцкай асамблеяй Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Таксама дэпутаты працягнуць практыку ўдзелу ў міжнародным назіранні за выбарамі ў вышэйшыя органы ўлады замежных краін.

Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі прыняў таксама дэкрэт «Аб парадку фарміравання і выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы». Новая рэдакцыя дакумента распрацавана з улікам шматгадовага вопыту арганізацыі бюджэтнага працэсу ў Саюзнай дзяржаве. Яна павінна працаваць у плане ліквідацыі недахопаў, якія выявіліся ў гэтай сферы, а таксама замацаваць механізмы ажыццяўлення бюджэтнага працэсу, што апраўдалі сябе на практыцы.

# РЫБАКА ВЫРАТАВАЛІ СПЕЦНАЗАЎЦЫ

**У Мінску на Свіслачы супрацоўнікі атрада міліцыі асаблівага прызначэння ГУУС выратавалі 81-гадовага рыбака, які праваліўся пад лёд.**

Міліцыянеры ўдзень неслі службу па ахове грамадскага парадку ў сталічным парку Перамогі — патрулявалі набярэжную ракі, калі пачулі крыкі аб дапамозе, паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама. Падбегшы да Свіслачы, яны ўбачылі ў 40 метрах ад берага чалавека, які тануў. Яго галава то з'яўлялася на паверхні, то знікала з віду... Міліцыянеры, скінуўшы бушлаты, кінуліся на дапамогу. Аднак адразу стала зразумела, што падбегчы да пацярпелага не атрымаецца: нетрывалы лёд пачаў прагінацца пад нагамі і трашчаць. Тады амапаўцы ляглі і папаўзлі да палонкі, прыхапіўшы палку, што трапіла на вочы. Аднак у пажылога чалавека ўжо аслабелі рукі... Адзін з міліцыянераў падпоўз бліжэй і ў нейкі момант здолеў схапіць спачатку адну руку рыбака, а потым і другую. Праз некалькі секундаў міліцыянеры змаглі выцягнуць пацярпелага на лёд і пацягнулі да берага. Там занеслі яго да «УАЗа» і даставілі ў бальніцу. Высветлілася, што 81-гадовы мінчанін выправіўся на рыбалку. Па лёдзе ён перасоўваўся на лыжах, але не разлічыў яго таўшчыню і апынуўся ў вадзе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Класныя навіны

# Google — у дапамогу настаўнікам

**Парк высокіх тэхналогій і карпарацыя Google запусцілі бясплатны інтэрнэт-курс для настаўнікаў «Базавыя сэрвісы для адукацыі». Першыя заняткі прайшлі ў вучэбным цэнтры Парка высокіх тэхналогій у Мінску, а таксама на базе IT-акадэмій у Лідзе і Навапалацку.**

У ходзе інтэрнэт-курса эксперты падзеляцца са слухачамі новымі ўменнямі і навыкамі, а слухачы, у сваю чаргу, змогуць абмяняцца вопытам з калегамі з усяго свету. У педагогаў будзе магчымасць даведацца, як іншыя настаўнікі арганізуюць праверку хатніх работ дзякуючы Google Drive, выкарыстоўваюць Google-карты, кантактуюць з вучнямі і іх бацькамі праз платформы Google, разам з класам абмяркоўваюць творы мастацтва, прадстаўленыя ў Акадэміі культуры Google, і г.д. Мэта курса — паказаць, як з дапамогай інтэрнэт-сэрвісаў можна індывідуалізаваць працэс навучання, абудзіць у вучняў інтарэс да ведаў і спрасціць задачы па правядзенні ўрокаў.

Каб запісацца на курс, трэба наведаць сайт http://g.co/basicsforteaching і зарэгістравацца там у якасці слухача. Слухачы, якія паспяхова выканаюць выніковы праект, змогуць атрымаць сертыфікат аб праходжанні курса.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ На думку дэпутата

# Трэба мець інструмент сустрэчных дзеянняў



**Парламентарый Мікалай Іванчанка, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, старшыня міжведамаснай працоўнай групы па каардынацыі дзейнасці, звязанай з пытаннямі харчавання насельніцтва, выказаў сваю думку наконт сённяшняй сітуацыі ў сферы беларуска-расійскага гандлю.**

— Дзеянні расійскага боку, нелагічныя нават у элементарным, — заўважыў дэпутат. — Забаронена пастаўка мяса птушкі ад нашых буйных птушкафабрык. Але ж там няма афрыканскай чумы свіней, да таго ж створана каласальная сістэма кантролю, звязаная з паступленнем сыравіны, яе перапрацоўкай, выпускам прадукцыі.

Мікалай Іванчанка лічыць, што ў сувязі з сітуацыяй з эмбарга на прадукцыю некаторых нашых прадпрыемстваў, якая склалася ў Расіі, такія дзеянні некаму «на руку».

— Нехта хоча пагрэць рукі за кошт павышэння цэн на гэту прадукцыю, — адзначыў дэпутат.

Мікалай Іванчанка лічыць, што са свайго боку нашай краіне трэба больш агрэсіўна выкарыстоўваць свае кантрольныя магчымасці па сустрэчным імпарце.

— Мы атрымліваем праз Расію не толькі прамысловыя тавары, да нас прыходзяць і харчовыя. Таму мы павінны граматна, аргументавана і вельмі пільна прыглядзецца да іх якасці. Тым больш што калі выкарыстоўваць нашу інструментальную базу пры праверках, то мы таксама можам знайсці нейкія значныя або нязначныя адхіленні, якія могуць стаць сур'ёзным інструментам для сустрэчных спрэчак.

Дэпутат упэўнены, што мы павінны заўсёды мець у руках інструмент нейкіх сустрэчных дзеянняў, на той выпадак, калі здараюцца такія сур'ёзныя рэчы, звязаныя з забаронай нашай прадукцыі.

— Гэта ўвогуле непрыгожа ў той сітуацыі, калі мы толькі што ратыфікавалі дагавор аб стварэнні нашага саюза — пакуль трох дзяржаў, у хуткім часе да яго далучацца яшчэ дзве, — заявіў парламентарый. — Яшчэ не высахла чарніла на подпісах, а ўжо пачынаюцца такія вось дзеянні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Энергетычная бяспека

# БелАЭС: ТАННЕЙШАЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ — ЧЫСЦЕЙШАЕ ПАВЕТРА

## Праз 5 гадоў нашай краіне неабходна дасягнуць зніжэння выкідаў вуглякіслага газу і дыяксіду азоту на 15% да ўзроўню 2010 года

**Ва ўсім свеце зніжэнне выкідаў парніковых газаў — задача глабальная, і Беларусь тут не выключэнне. Аднак выконваць падобныя задачы трэба з розумам. Проста пазакрываць старыя электрастанцыі на вугалі ці мазуце нерэальна. Магчыма, што дапамагчы выканаць нацыянальную праграму па выкідах зможа будучая атамная станцыя. Менавіта тэме атамнай энергетыкі была прысвечана анлайн-канферэнцыя з беларускімі экспертамі на сайце БЕЛТА.**

### Цалкам адмовіцца ад імпарту

У першую чаргу звычайных людзей цікавіць пытанне кошту гэтай самай электрычнасці. І сапраўды, наколькі падаражэюць або патаннеюць тарыфы на энергію пасля ўвода ў эксплуатацыю нашай атамнай электрастанцыі? **Начальнік упраўлення энергаэфектыўнасці Міністэрства энергетыкі Беларусі Міхаіл МАЛАШЭНКА** лічыць, што ўвод БелАЭС прывядзе да загрузкі найбольш эфектыўнага існуючага абсталявання энергасістэмы з меншым удзельным выдаткам на выпрацоўку электрычнай энергіі. Сабекошт кілават-гадзіны на Беларускай АЭС будзе істотна ніжэйшы, чым той электраэнергіі, якая выпрацоўваецца намі цяпер. Натуральна, што з уводам у эксплуатацыю БелАЭС энергетычны прадукт для спажыўца будзе таннець, бо ў сваім балансе, пачынаючы з 2018 года, мы цалкам адмовімся ад імпарту электрычнай энергіі.

**Колькасць прыхільнікаў развіцця ядзернай энергетыкі ў краіне вырасла з 28,3% у 2005 годзе да 49,8% у 2014-м.**

У перспектыве (пры спрыяльных геапалітычных умовах) мы зможам пастаўляць электраэнергію ў краіны блізкага і далёкага замежжа. І гэта адаб'ецца на сабекошце канчатковага прадукту для айчынных спажыўцоў — як рэальнага сектара, так і фізічных асоб, упэўнены спецыяліст. Атрымліваецца, што праз пэўны час ад работы нашай «атамкі» выйграем усе мы.

### Эканомія 5 млрд кубаметраў газу

Са спажыўцамі зразумела. А ў чым рэальныя плюсы для эканомікі і экалогіі Беларусі ад будаўніцтва атамнай станцыі? Самае галоўнае ў тым, што атамная станцыя з'яўляецца найбольш экалагічна чыстай у параўнанні са станцыямі, якія працуюць на прыродным газе, паколькі выкідаў абсалютна няма, расказвае **начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва, падрыхтоўкі кадраў і інфармацыйнага забеспячэння Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Беларусі Лілія ДУЛІНЕЦ.** Што да эканомікі, то яна прадугледжвае замену каля 5 млрд кубічных метраў прыроднага газу штогод. Структура выдаткаў на вытворчасць электраэнергіі ў атамнай энергетыцы істотна адрозніваецца, паколькі сабекошт атамнай энергіі вызначаецца ў асноўным капітальнымі ўкладаннямі ў будаўніцтва АЭС, а не паліўнымі выдаткамі. Так, у сабекошце кілават-гадзіны электраэнергіі на станцыях, якія працуюць на прыродным газе, паліўны складнік мае больш за 75%, а на атамных ён не перавышае 20%. Прычым выдаткі на прыродны ўран знаходзяцца ў межах 5–7%. Таму рост коштаў на прыродны ўран і ядзернае паліва ў значна меншай ступені ўплываюць на кошт выробленай электраэнергіі.

Што ж тычыцца экалагічнага аспекту ўплыву АЭС, то з усіх тэхналогій вытворчасці электраэнергіі, якія дзейнічаюць сёння, толькі атамная энергетыка здольная забяспечыць устойлівае развіццё без вычэрпвання эканамічных і экалагічных рэсурсаў, а таксама супрацьстаяць глабальным кліматычным зменам на планеце, так званаму парніковаму эфекту.

### Зніжаем выкіды парніковых газаў

У нядаўна распаўсюджанай заяве Міністэрства эканомікі, гандлю і прамысловасці Японіі гаворыцца пра тое, што ў краіне рэзка ўзраслі выкіды вуглякіслага газу. І звязана гэта з тым, што пасля аварыі на АЭС «Фукусіма-1» усе 48 атамных рэактараў былі заглушаны і на змену ядзернаму паліву ў якасці энерганосьбітаў прыйшлі арганічныя віды паліва. Як лічаць іх эксперты, калі гэтыя АЭС адновяць працу, выкід парніковых газаў істотна зменшыцца. У сувязі з гэтым урад Японіі заявіў аб тым, што вяртанне да атамнай энергетыкі непазбежна, а некалькі станцый ужо рыхтуюцца да запуску.

Згодна з Дзяржаўнай праграмай развіцця беларускай энергетычнай сістэмы на перыяд да 2016 года, нам неабходна да 2020 года забяспечыць зніжэнне выкідаў вуглякіслага газу і дыяксіду азоту не менш чым на 15% да ўзроўню 2010 года. Тут Міхаіл Малашэнка перакананы, што зніжэнне выкідаў забруджвальных рэчываў забяспечваецца за кошт укаранення найбольш эфектыўных сродкаў ачысткі выкідных газаў ад цвёрдых часцінак і дыяксіду серы, сучасных сродкаў зніжэння выкідаў аксіду азоту і дыяксіду вугляроду; выкарыстання аптымальных тэмпературна-цеплавых рэжымаў эксплуатацыі кацельнага абсталявання і ўдасканалення канструктыўных элементаў і гэдак далей.

Скарачэнне выкідаў парніковых газаў будзе забяспечвацца за кошт удасканалення арганізацыйна-эканамічнай палітыкі энергазберажэння; павышэння каэфіцыента карыснага выкарыстання энерганосьбітаў на ўсіх стадыях вытворчасці, транспартавання і спажывання; павелічэння ў паліўным балансе краіны аднаўляльных крыніц энергіі і другасных энергарэсурсаў.

Асноўны складнік эфекту па гэтым напрамку будзе дасягнуты за кошт укаранення экалагічна і эканамічна эфектыўных відаў абсталявання і тэхналогій, а таксама выцяснення арганічнага паліва з паліўнага балансу энергасістэмы за кошт уводу ў эксплуатацыю двух блокаў АЭС. Таксама з улікам укаранення парагазавых тэхналогій, надбудоў газатурбінных установак на існуючых аб'ектах і ўводу ў эксплуатацыю АЭС, да 2020 года прагназуецца двухразовае скарачэнне экалагічнай нагрузкі энергакрыніц энергасістэмы на навакольнае асяроддзе. Увод у эксплуатацыю двух блокаў сумарнай электрычнай магутнасцю 2400 мегават дазволіць замясціць каля 5 млрд кубаметраў імпартнага прыроднага газу. Адпаведна, на гэтую ж велічыню скароцяцца і цеплавыя выкіды ад спальвання газу, якія ўплываюць на рост парніковага эфекту.

Рэалізацыя захадаў, прадугледжаных дзяржпраграмай, дазволіла скараціць сумарныя выкіды забруджвальных рэчываў па сістэме «Белэнерга» з 45,3 тысячы тон у 2010 годзе да 33,3 тысячы тон у 2013-м. Выкіды аксідаў азоту скараціліся адпаведна з 27,7 тысячы тон да 23,6 тысячы тон. Праводзіцца актыўная праца па зніжэнні ўдзельных нормаў на выпрацоўку цеплавой электрычнай энергіі, зніжэння страт у электрычных цеплавых сетках. Тут краіна да 2016 года павінна знізіць страты на два працэнтныя пункты. Усё гэта пацягне за сабой памяншэнне выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра.

### Самы чысты від энергіі

Кажуць, што вугальныя цеплавыя электрастанцыі ў некалькі разоў мацней забруджваюць навакольнае асяроддзе, чым АЭС.

Тэхнагеннае ўздзеянне на чалавека і навакольнае асяроддзе пры вытворчасці электраэнергіі несумненна прысутнічае, расказвае Лілія Дулінец. Цяпер наша задача — гэта ўздзеянне мінімізаваць. З гэтага пункту гледжання атамная энергетыка з'яўляецца самай экалагічна чыстай з усіх даступных сёння крыніц энергіі. Так, пры рабоце цеплавых электрастанцый, якія выкарыстоўваюць у якасці паліва мазут, каменны вугаль і прыродны газ, у навакольнае асяроддзе выкідваюцца наступныя забруджвальныя рэчывы: вуглякіслы газ, які з'яўляецца асноўнай прычынай парніковага эфекту і выклікае глабальнае пацяпленне; дыяксід серы, які выклікае кіслотныя дажджы; аксіды азоту, якія раздражняюць нашы лёгкія і выклікаюць рэспіраторныя захворванні. Усе пералічаныя выкіды падчас работы АЭС адсутнічаюць.

Акрамя таго, электрастанцыя на каменным вугалі за год пакідае ў адвалах 250 тысяч тон нелятучага попелу і шлаку. Паколькі каменны вугаль з'яўляецца натуральна радыеактыўным з-за наяўнасці ў ім дамешак урану, то такая радыеактыўнасць трапіць потым і ў атмасферу.

**АЭС, бясспрэчна, з'яўляецца найбольш экалагічна чыстай, а значыць пераважнай крыніцай энергіі на сённяшні дзень.**

Спадарыня Дулінец паведаміла, што ў 2002 годзе Міжнароднае энергетычнае агенцтва правяло маштабнае даследаванне ўплыву розных відаў энергетыкі на жыццё і здароўе людзей. Улічвалася мноства параметраў, уздзеянне таго ці іншага паліва на ўсіх этапах яго жыццёвага цыклу — ад здабычы да ўтылізацыі, а таксама колькасць звязаных з электрагенерацыяй смерцяў, як у выніку няшчасных выпадкаў і аварый, так і з прычыны выкідаў шкодных рэчываў і радыяцыі. Вынік даследавання такі: самая бясшкодная энергія — атамная, а больш за ўсё смерцяў у разліку на мегават выробленай электрычнасці выклікае спальванне вугалю. Уся справа ў выкідах з вугальных электрастанцый. Дадаюць да статыстыкі звязаных з вугалем смерцяў і шматлікія аварыі на вугальных шахтах, а таксама забруджванне пры транспартаванні паліва. Такім чынам, АЭС, бясспрэчна, з'яўляецца найбольш экалагічна чыстай, а значыць пераважнай крыніцай энергіі на сённяшні дзень.

На гэты конт сваю думку выказаў **начальнік аддзела экспертызы прамысловых аб'ектаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль КАВАЛЕНКА.** Паводле яго слоў, пры ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе быў праведзены аналіз альтэрнатыўных варыянтаў вытворчасці электраэнергіі. У справаздачы параўналі паказчыкі па выкідах ад газавых і вугальных кацельняў і тых, якія выкарыстоўваюць у якасці паліва мазут. Па выніках даследавання зроблена выснова, што ўздзеянне атамнай электрастанцыі на экалагічнае становішча з'яўляецца самым прымальным. Навакольнае асяроддзе забрудзяць толькі выкіды пусканаладачнай кацельні на момант пусканаладачных работ на атамнай электрастанцыі (каля 93 тон). Калі б працавала вугальная кацельня, то выкіды забруджвальных рэчываў склалі б каля 17 тысяч тон за год, а выкіды парніковых газаў — больш за 5 млн тон за год.

### Бяспека новага пакалення

Зразумела, што нашай грамадскасці неабыякава, якім будзе першы ядзерны аб'ект у краіне. Асабліва ў плане яго бяспекі. **Намеснік генеральнага дырэктара «Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Аляксандр ТРЫФАНАЎ** адзначыў, што асаблівая ўвага пры праектаванні электрастанцыі надаецца сістэме бяспекі. Увогуле, у праектаванні існуе дзве крайнасці: амерыканскі варыянт, дзе ствараюцца чыста пасіўныя сістэмы бяспекі, і французскі, дзе выкарыстоўваюцца актыўныя сістэмы, якія патрабуюць падводу знешняй энергіі. У Беларусі будзе пабудавана атамная станцыя новага пакалення — расійскі праект «АЭС-2006» з рэактарамі тыпу ВВЭР пакалення «тры плюс», які цалкам адпавядае міжнародным нормам і рэкамендацыям МАГАТЭ. Аляксандр Трыфанаў упэўнены, што беларуская АЭС уяўляе сабой разумнае спалучэнне актыўнай і пасіўнай сістэм, якое павялічвае бяспеку станцыі. Перад пачаткам будаўніцтва экспертыза ядзернай радыяцыйнай бяспекі праводзіцца як вядучымі беларускімі спецыялістамі, так і экспертамі з МАГАТЭ.

### Прыхільнікаў стала значна больш

Кіраўніцтва краіны і спецыялістаў энергетычнай галіны заўсёды цікавіла стаўленне грамадскасці да будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусі. Таму, паводле слоў Ліліі Дулінец, на заказ Мінэнерга інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пачынаючы з 2005 года, рэгулярна праводзіць сацыялагічныя апытанні грамадскай думкі па пытаннях развіцця ядзернай энергетыкі і ўспрымання насельніцтвам будаўніцтва АЭС.

Апошнія вынікі сацапытання паказалі, што колькасць прыхільнікаў развіцця ядзернай энергетыкі ў краіне вырасла з 28,3% у 2005 годзе да 49,8% у 2014-м, у той жа час колькасць праціўнікаў АЭС знізілася з 46,7% у 2005 годзе да 19,7% у 2014-м.

Зразумела, што вялікі ўплыў на грамадскую думку — не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце, аказала аварыя на АЭС «Фукусіма-1» у Японіі (у 2011 годзе). Пасля гэтай аварыі колькасць прыхільнікаў скарацілася, але цяпер гэтая крывая павольна, але ўпэўнена ідзе ўгору.

Прычым ні сама Японія, ні іншыя краіны не адмовіліся ад выкарыстання атамнай энергіі. Але ўрокі «Фукусімы» былі старанна вывучаны і прыняты неабходныя захады для недапушчэння падобных аварый у будучыні.

**Сяргей КУРКАЧ**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

aquabel

**ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район» проводит аукцион по продаже следующего имущества:**

| № лота | Наименование объекта | Год выпуска | Адрес объекта | Начальная стоимость объекта, бел. руб. с НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Прицеп KRONE ADP 24, рама № MW1036497, б/у | 1991 г.в. | д. Курганы, Минский р-н | 30 972 000 | 3 097 200 |

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район», адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.

**Торги состоятся 17.12.2014 года в 10.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административный блок ГВП, 2-й этаж, к. 208.**

Шаг аукциона – **5%** начальной стоимости объекта.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности.

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесения задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

*Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район» № 3012204960010 в ф-ле Минская городская дирекция ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 153001963, УНН 600438617.*

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе объектов осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 10 банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **16.12.2014 года 14.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 3-й этаж, комната 303.

**Тел.: (017)237-91-32, (029)261-02-84.** УНП 600438617

## ОАО «Амкодор-Белвар»

220005, г. Минск, проспект Независимости, 58

**Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров**
**Собрание состоится 19 декабря 2014 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседаний Общества (корпус № 30, 3 этаж).**

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55. Орган, созывающий собрание: Совет директоров. Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 5 декабря 2014 года. Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 12 декабря 2014 года.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О реорганизации ОАО «Амкодор-Белвар» путем присоединения к нему ООО «БЕЛ-ФЕР»».
2. О заключении договора о присоединении и наделении полномочиями на подписание договора о присоединении.
3. Об утверждении договора о присоединении.
4. Об утверждении передаточного акта.
5. О внесении изменений в Устав ОАО «Амкодор-Белвар».
6. О выпуске акций.
7. О выкупе акций в связи с реорганизацией ОАО «Амкодор-Белвар» по требованию его акционеров.
8. Об избрании членов Совета директоров.

С информацией (материалами), подлежащей представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 15 декабря 2014 года в бухгалтерии Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 100363840 **Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар»**

УНП 290671335

**ДОПОЛНЕНИЕ К ГОДОВОМУ ОТЧЕТУ ОАО «Гранд Фэшен Хаус» за 2013 год,**
***опубликованному в газете «Звязда» 26 марта 2014 года, по состоянию на 01 января 2014 года***

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| Наименование показателей | Единицы измерения | за 2013 год | за 2012 год |
|---|---|---|---|
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 50 647 | 0 |

Количество акционеров: **всего – 42, в том числе, юридических лиц – 7, из них нерезидентов РБ – 3, физических лиц – 35, из них нерезидентов РБ – 3.**

Правила корпоративного поведения применяются, Регламент работы ОАО «Гранд Фэшен Хаус» с реестром владельцев ценных бумаг утвержден очередным общим собранием акционеров 04.03.2010 г., ведется учет аффилированных лиц Общества в соответствии с Положением об учете аффилированных лиц, утвержденным решением совета директоров от 25.06.2009 г.